В. Ластоўскага. Руска-беларуская частка налічвае 594, а беларуска-руская – 623 слоўнікавыя артыкулы. Тэрміналогія выдання арыентуецца на тэрмінасістэму «Элементарнай матэматыкі», многія тэрмінаадзінкі былі перанесены з вышэйназванага падручніка А. Луцкевіча. Геаметрычныя і трыганаметрычныя тэрміны, што не зафіксаваны ў адзначаных працах, ствараліся ўкладальнікамі, якія «бралі найбліжэйшае слова або карэнь слова і прыстасоўвалі яго гэтакім чынам, каб новы тэрмін даваў яснае прадстаўленьне аб зьмесьце паняцьця» [3, с. 4]: *касада* ‘дыяганаль’, *кругляч* ‘цыліндр’, *кучмень* ‘конус’, *лучак* ‘радыус’, *тасунак* ‘адносіны’, *пласмо* ‘плоскасць’, *рамо* ‘катэт’ і інш. Такія тэрмінаадзінкі ў слоўніку звычайна падаваліся побач з запазычанымі. Інтэрнацыянальныя тэрміны, што «атрымалі пашырэньне і перадаюць спэцыфічныя адцені», укладальнікі ўключалі ў слоўнік, «надаючы ім толькі фонэтыку беларускую» [3, с. 4]: *іррацыянальны, геамэтрыя, прапорцыя, пэрпэндыкуляр, радыян, сфэра, сэканс*. Прыярытэт мелі сціслыя па форме адзінкі, аўтары лічылі важным, каб тэрмін быў «зычны і прыгожа гучэў» [3, с. 4]. Акрамя таго, укладальнікі карысталіся некаторымі літоўскімі тэрмінаграфічнымі крыніцамі, у прыватнасці, зборнікамі тэрмінаў па геаметрыі і трыганаметрыі З. Жамайціса, па арыфметыцы і алгебры М. Шыкшнуса. Пазней В. Ластоўскі ўключыў каля 200 найбольш ужывальных тэрмінаў са «Слоўніка Геамэтрычных і Трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў» у свой «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», выдадзены ў Коўне ў 1924 г.

Другі этап пурыстычнага перыяду ў развіцці беларускай матэматычнай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі (1927 – 1933 гг.) характарызуецца тым, што асобныя даследчыкі (М.Я. Байкоў, Ю.М. Дрэйзін, А.Ю. Лёсік) прыходзяць да высновы пра няздольнасць дыялектнай мовы служыць рэальнай асновай для фарміравання галіновых тэрмінасістэм. Галоўнай памылкай аўтараў першых выпускаў “Беларускай навуковай тэрміналогіі” называецца імкненне тэрміналагізаваць дыялектныя словы пры амаль поўным ігнараванні інтэрнацыянальных лексем.

Літаратура

1. Аглядальнік. Некаторыя ўвагі на беларускую літаратурную тэрмінолёгію / Аглядальнік // Полымя. − 1923. − № 7 − 8. − С. 80 − 85.
2. Більдзюкевіч, Л. Асновы беларускае матэматычнае тэрміналёгіі / Л. Більдзюкевіч // Школа и культ. Сов. Белоруссии: Бел. аддзел. − 1921. − № 1−2. − С. 23 − 27.
3. Дуж-Душэўскі, К. Слоўнік Геамэтрычных і Трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў (Расійска-беларускі і беларуска-расійскі) / К. Дуж-Душэўскі, В. Ластоўскі. − Коўна: Друкарня бр. М. і Л. Гурвіч, 1923. − 126 с.
4. Лукашанец, А.А. Сучасныя працэсы ў словаўтварэнні беларускай мовы: да праблемы міжмоўнага збліжэння і адштурхоўвання / А.А. Лукашанец // Мовазнаўства. Літаратура. Культуралогія. Фалькларыстыка: XIII Міжнар. з’езд славістаў (Любляна, 2003): дакл. белар. дэлегацыі. − Мінск: Белар. навука, 2003. − С. 52 − 69.
5. Jurewič, G. Zadačnik dla pačatkowaj školy. Pieršy hod nawuki / G. Jurewič. − Wilnia: Znicz, 1916. − 31 s.
6. Jurewič, G. Zadačnik dla pačatkowych škol. Druhi i trejci hod nawuki / G. Jurewič. − Wilnia: Homan, 1916. − 112 s.

В.Э. Зіманскі (Віцебск)

БЕЛАРУСКАЯ АРФАГРАФІЯ-2008: ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ

23 ліпеня 2008 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Закон Рэспублікі Беларусь № 420-З “Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” [6]. Згодна з прынятым Законам, новая рэдакцыя “Правіл” уступае ў дзеянне з 1 верасня 2010 г.

Заўважым, што ў апошняе дзесяцігоддзе былі створаны сістэматызаваныя дапаможнікі па беларускай мове [1], [4], [5] і інш., у якіх аўтары імкнуліся скрупулёзна

Репозиторий ВГУ

адлюстраваць разнастайныя варыянты правапісных нормаў. Тым не менш гэта не адмяняла неабходнасці кадыфікацыі назапашаных за дзесяцігоддзі змен. Наколькі ж уніфікаваўся і стабілізаваўся беларускі правапіс? Паспрабуем знайсці адказ на гэта пытанне, прасачыўшы за зменамі і ўдакладненнямі, унесенымі ў правапіс зычных у новай рэдакцыі арфаграфічных нормаў беларускай мовы.

Правапіс зычных разгледжаны ў Главе 2 "Правіл". Акрамя таго, у Главе 5 разглядаецца правапіс зычных у прыстаўках і суфіксах.

Правапіс звонкіх і глухіх зычных (§ 11) не зведаў істотных змен, толькі ў п. 2 гэтага параграфа не прадстаўлена прыкладаў уласнабеларускіх слоў, пра якія сказана ў правіле.

Дастаткова падрабязна і без істотных паправак выкладзены правапіс *д, т, дз, ц* (§ 12), у якім удакладнены напісанні тыпу *ліцвін, ліцвінка, твіст, мардве, у Літве*.

Лагічна і даступна выкладзены правапіс некаторых спалучэнняў зычных (§ 13), у якім змены ўнесены ў напісанне спалучэнняў *стн → сн* у запазычаных словах (*кантрасны, фарпосны*). Спалучэнні тыпу *нтн, фтн, льтн, ктн*, якія не ўваходзяць у правіла, адпаведна, пішуцца без змен (*дэсантны, ландшафтны, асфальтны, абстрактны*).

У § 14 выкладзены правілы ўжывання прыстаўных (у пачатку слова) і ўстаўных (у сярэдзіне) зычных *в, г*. Адпаведна, пункты №№ 4, 6 рэгламентуюць напісанне ўстаўнога *в* у словах тыпу *ніводзін, Лявон, есавул, каравул, павук, Тадэвуш* і інш., а таксама вытворных ад іх. Удакладнена напісанне слоў *окаць, одум, вохра*, рэгламентуецца ўжыванне прыстаўнога *в* перад націскнымі прыстаўкамі *о-, об-, од- (от-), у-, уз- (ус-)*; пры гэтым асобна не агаворана адсутнасць прыстаўнога *в* у словах з іншымі прыстаўкамі (што, відаць, павінна лагічна выцякаць з вышэйсказанага), а таксама ў выпадках, калі [у] развілося з [в] (напр., *удава, унук, улада, учора*), і ў слове *наогул*. Ці павінна гэта азначаць, што ўзаконены напісанні *вудава, вунук, вулада, навогул*? Праўда, у п. 5, дзе гаворыцца пра ўжыванне прыстаўнога *в* перад каранёвым [у], прыведзены прыклады толькі з націскным [у] (*вугал, вузел, вуліца*), але ж у правіле пра націск нічога не сказана.

Найбольш істотныя змены ў правапісе зычных унесены ў правіла ўжывання *ў* нескладовага (§ 15). Зняты амаль усе абмежаванні, якія датычыліся запазычаных слоў: цяпер *ў* пішацца і ў пачатку (*ва ўніверсітэце*), і ў сярэдзіне слоў (*саўна, фаўна, раўнд*). Не скарачаецца націскное [у] (*аул, Брэсцкая унія*), ненацiскное [у] ў канцы запазычаных слоў (*фрау, ток-шоу*), не змяняецца *у* ў словах з канцавымі спалучэннямі *-ум, -ус* (*кансіліум, соус*) і чамусьці ў слове *траур*. Не згадваецца ў правіле таксама пра скарачэнне [у] пасля злучка (словы тыпу *па-ўзбекску, жанчына-ўрач*). Астатнія пункты правіла засталіся без змен.

Цікава, што ў п. 1 сярод прыкладаў напісання *ў* пры чаргаванні [л] з [ў] прыведзены словы *воўк, шоўк, шчоўк, поўны, коўзкі, моўчкі, змоўклі, паўметра*, у якіх пры сінхронным аналізе немагчыма знайсці гэта чаргаванне (як і названае ў правіле чаргаванне [в] з [ў] у словах *аўторак, каўбой, аўгур, Аўстрыя, Аўдоцця, Аўрора, Каўказ, Боўш, Роўда, аўгіевы*). Дарэчы, цікавую з'яву назіраем у прыкладзе *аўдыякасета* – напісанне *ыя*, якое не пракаменціравана ні ў § 2, ні ў § 9, як і асобнае ўжыванне першай часткі гэтага слова (*аўдыа*? як *Токіа*).

У § 16 "Нескладовае *й*" разам з правілам ужывання *й* на месцы *і* пасля прыставак, якія заканчваюцца на галосны, чамусьці зноў згадваецца пра перадачу на пісьме спалучэння [й] з галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання, хаця гэтыя выпадкі былі падрабязна апісаны ў § 9. У п. 1, зноў-такі, не згадваецца пра захаванне *і* пасля першай часткі складанага слова (*аўтаінспектар*) і ў націскным становішчы (*пераігрываць*). Дарэчы, п. 2 можна было дапоўніць прыкладамі з іншамоўнымі прыстаўкамі на зычны,

Репозиторий ВГУ

якія чамусьці апісаны толькі ў § 22, п. 13. У ім з былога пераліку іншамоўных прыставак (прэфіксоідаў) выключаны *суб-, дэз-* (*субынспектар, дэзынтэгратар*); наадварот, ёсць прыстаўка (прэфіксоід) *супер-* (*суперінтэлект*) (дарэчы, як наконт слоў *гіперінфляцыя, постіндустрыяльны*? Пра гэтыя прыстаўкі (прэфіксоіды) у правіле таксама нічога не сказана, значыць, [і] павінна змяняцца ў [ы]?).

У правапіс падоўжаных і падвоеных зычных (§ 17) і правапіс змякчальнага мяккага знака (§ 18) і раздзяляльнага мяккага знака і апострафа (§ 19) істотных змен не ўнесена. Тым не менш, з пераліку слоў, у якіх адсутнічае падаўжэнне (§ 17, п. 3 – *Ілья, Касьян* і пад.) чамусьці выключаны прыставачныя асабовыя формы дзеяслова *ліць* (раней: *лью і лію* [2, с. 365], *вылью і вылію*); няма іх і ў правілах ужывання раздзяляльнага мяккага знака. Правапіс мяккага знака пашыраны на прыметнікі з суфіксам *-ск-*, утвораныя ад кітайскіх і мангольскіх назваў (§ 18, п. 7 – *чань-чунскі, цянь-шанскі*). Пры напісанні апострафа згадваюцца словы з першай часткай *шмат-* (§ 19, п. 4 – *шмат'ёмісты*). Астатнія пункты гэтых правілаў засталіся без змен.

У Главе 5 "Правілаў" разгледжаны правапіс некаторых марфем. У гэтай главе разгледжаны аднамарфемныя прыназоўнікі (§ 21), прыстаўкі (§ 22) і суфіксы (§ 23). На жаль, па-за межамі раздзела застаўся правапіс канчаткаў, дзе можна было чакаць удакладненняў, асабліва ў правапісе канчаткаў назоўнікаў II скланення, асабовых і ўласных назоўнікаў.

У правапіс прыставак не ўнесена значных змен. Вялікая ўвага ўдзелена правапісу прыставак *су-* і *са-*; аднак пасля даволі разгорнутага пераліку выпадкаў ужывання гэтых прыставах зроблена заўвага, якой, здаецца, можна было абмежавацца з самага пачатку: "Напісанне прыставак *су-* і *са-* ў іншых выпадках вызначаецца па слоўніку" [6, с. 30]. Не надае яснасці і фармулёўка, якая тлумачыць адсутнасць падваення літар у словах тыпу *інавацыя, ірэальны, акамадацыя, акорд* і пад.: "…калі слова ўспрымаецца як невытворнае ў беларускай мове" [6, с. 30]. Атрымліваецца, што, напрыклад, у рускай мове, дзе літары падвойваюцца, усе гэтыя словы ўспрымаюцца як вытворныя?

Раздзелены напісанні прыстаўкі *дыз-/дыс-* (*дызартрыя, дыз'юнкцыя, дысгармонія, дыспрапорцыя, дыскамфорт*) і прыстаўкі *дэз-*, якая фактычна ўжываецца толькі перад пачатковымі галоснымі (пішацца нязменна – *дэзактывацыя, дэзарыентацыя*; адпаведна *дэзкамера – дэзынфекцыйная камера*). У астатнім правапіс прыставак не змяніўся, як не змяніўся і склад выключэнняў (*расол, расольнік, расада, расаднік, разявіць, узлаваць, узлавацца, рашчыніць* (паставіць цеста), *ушчуваць, нішчымны, рошчына, ушчуванне, ушчунак, нішчымніца*), да якіх у метадычных мэтах можна дадаць словы *нашчадак, шчасце, пяшчота, знішчыць, дашчэнту, ушчэнт, шчэпкі, пошчак*. Аб зменах у правапісе *і* пасля прыставак на зычны (§ 22, п. 13) было сказана вышэй.

Нарэшце, выклікае пытанне наяўнасць прыстаўкі *із-(іс-)* (у "Марфемным слоўніку беларускай мовы" А.М.Бардовіча, Л.М. Шакуна з гэтай прыстаўкай ужыта толькі слова *ізноў* [2, с. 252], хоць, на нашу думку, галосны *і* тут прыстаўны; аднак у такім разе *із-* – варыянт прыстаўкі *з-*); тым больш сумнеўна прыводзіць у якасці прыкладу напісанняў з такой прыстаўкай слова *іспыты* [6, с. 31].

Не зведаў значных змен і правапіс суфіксаў (§ 23). Гэта датычыцца і правапісу суфіксаў дзеясловаў (пп.1-6), і правапісу суфіксаў дзеепрыметнікаў (пп. 7-9), і правапісу суфіксаў назоўнікаў (пп. 10-17), і правапісу суфіксаў прыметнікаў (пп. 18-19). Трэба адзначыць больш дакладную ў параўнанні з папярэдняй рэдакцыяй фармулёўку правіл ужывання суфікса *-ірава- (-ырава-)* (пры аманіміі з дзеясловамі з суфіксам *-ава- (-ява-)* – *газіраваць*); калі дзеяслоў без *-ір- (-ыр-)* губляе свою фармальную і семантычную акрэсленасць – *лабіраваць*; калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне – *манціраваць*) [6, с. 33], а таксама падрабязна апісаныя выпадкі ўжывання суфікса *-шчык- (-шчыц-)* [6, с. 36]. Разам з тым у падрабязна разгледжаных выпадках ужывання

Репозиторий ВГУ

суфіксаў *-чын- і -шчын-* (§ 17) можна было пакінуць ранейшае тлумачэнне напісання спалучэння *ччын*: калі базай для ўтварэння назоўніка паслужыў прыметнік на *-цкі*, дзе [ц] не са спалучэння [тс] (*Полацк – полацкі – Полаччына, Турцыя – турэцкі – Турэччына*, але: *Брэст – брэсцкі – Брэстчына*). Удакладнены фармулёўкі правіл напісання суфіксаў *-ск-* і *-ств-* (п. 21), а таксама правапіс падвоенага *нн* (п. 20) і падвоенага *цц* (п. 22). Сам правапіс у гэтых выпадках не змяніўся.

Такім чынам, новая рэдакцыя "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", выявіўшы імкненне сапраўды спрасціць і ўніфікаваць беларускі правапіс, на жаль, пакінула неабходнасць у дадатковых метадычных і лінгвістычных каментарыях, а ў асобных выпадках – у звяртанні да іншых лінгвістычных і метадычных даведнікаў, такіх, як, напрыклад, "Беларускі арфаграфічны слоўнік" пад рэдакцыяй А.А. Лукашанца [3] і інш.

Літаратура

1. Арашонкава, Г.У. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс: Вымаўленне: Націск: Словазмяненне: Словаўжыванне. / Пад рэд. В.І.Рабкевіча. / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 367 с.
2. Бардовіч, А.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М.Шакун. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 1989. – 718 с.
3. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л.П. Кунцэвіч, І.У. Кандраценя; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 695 с.
4. Малажай, Г.М. Беларуская мова: Дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання / Г.М.Малажай. – 3-е выд. – Мн.: Аверсэв, 2005. – 368 с.
5. Марозава, Я.Н. Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання: дапаможнік для слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі / Я.Н. Марозава. – Віцебск: Выд-ва УА "ВДУ імя П.М.Машэрава", 2008. – 150 с.
6. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 144 с.

І.М. Зуева (Віцебск)

САСТАЎНЫЯ АДЗІНКІ ІМЕНАВАННЯ ПРЫ ЗВАРОЦЕ ДА АСОБЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ДРАМАТЫЧНЫХ ТВОРАЎ У. КАРАТКЕВІЧА)

Звароты з'яўляюцца самым універсальным, распаўсюджаным этыкетным знакам у мастацкіх творах у цэлым і ў драматычных у прыватнасці, бо без іх не абыходзіцца ні адзін дыялог герояў. Звароты-паэтонімы (як у спалучэнні з агульнымі назоўнікамі, так і без іх) выклікаюць цікавасць, бо яны выконваюць і намінатыўную функцыю, і адрасную (функцыю ўласна звароту). Па нашых назіраннях, пераважнае месца сярод усіх формул іменавання, якія выступаюць у якасці звароту, займаюць адначленныя канструкцыі, хаця састаўныя адзінкі наймення з'яўляюцца больш інфарматыўнымі. Менавіта яны дазваляюць не толькі значна шырэй ахарактарызаваць асобу, якой адрасаваны зварот, але і даюць магчымасць прасачыць суб'ектыўныя адносіны камунікантаў, устанавіць адпаведнасць выбару формы звароту нормам маўленчага антрапанімічнага этыкету.

Паспрабуем устанавіць структуру і матывацыю ўжывання мнагачленных формул іменавання пры звароце да асобы ў драматычных творах У. Караткевіча ў разнастайных сітуацыях і ўмовах зносін. Асноўнымі крытэрыямі, якія прадвызначаюць выбар зваротаў-паэтонімаў, будуць сацыяльны статус і ўзрост камунікантаў, абставіны, у якіх адбываецца камунікатыўны акт, адносіны суразмоўнікаў.

Антрапанімнае напаўненне састаўных адзінак іменавання асоб пры згаданым тыпе маўленчых зносін рэалізуецца ў двухчленнай мадэлі "ўласнае асабовае імя + про-

Репозиторий ВГУ